Напярэдадні

# КНІГІ ЯК НАГОДА ДЛЯ СУСТРЭЧЫ

**XXVI Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш, якая збярэ гасцей і ўдзельнікаў з 6 да 10 лютага 2019 года, пройдзе пад дэвізам «Больш чым кнігі». 3000 квадратных метраў выставачнай плошчы, звыш 300 экспанентаў, 35 краін-удзельніц, больш чым 30 старонак праграмы мерапрыемстваў і каля 60 тысяч чаканых наведвальнікаў — тыя лічбы, якія ўжо сёння характарызуюць будучы форум.**


Фота Андрэя САЗОНАВА.

«Каб прывабіць і зацікавіць не толькі прафесіяналаў кніжнага рынку, але таксама шырокае кола наведвальнікаў — патэнцыйных чытачоў, мы пастараліся ўзяць усё найлепшае, напрацаванае за папярэднія 25 гадоў», — адзначыў **намеснік міністра інфармацыі Ігар БУЗОЎСКІ**. Так, на цэнтральным стэндзе Міністэрства інфармацыі ўжо традыцыйна будзе прадстаўлены праект «У пошуках страчанага», упершыню рэалізаваны Уладзімірам Ліхадзедавым 15 гадоў таму: аднойлены па старажытных чарцяжах друкарскі станок XVI стагоддзя, калекцыя рэдкіх кніг, газет і часопісаў; арыгінал кнігі Францыска Скарыны «Малая падарожная кніжыца» 1522 года выдання, электронную версію якога можна будзе пагартаць і нават паспрабаваць прачытаць.

Акрамя правераных часам схем, пры падрыхтоўцы да выстаўкі задзейнічаны і новыя фарматы. Так, у першы дзень работы выстаўкі возьме старт арт-праект «Мірны танк», прысвечаны 75-годдзю вызвалення Беларусі — 75 мірным гадам жыцця: інсталяцыя будзе збірацца з... кніг, якія кожны ахвотны можа прынесці з сабой ці набыць на кірмашы. Пасля закрыцця форуму сабраныя кнігі, дарэчы, плануецца перадаць у дзіцячыя і медыцынскія ўстановы.

Асноўным мерапрыемствам другога дня выстаўкі стане V Міжнародны сімпозіум літаратараў «Пісьменнік і час», удзел у якім возьмуць больш як 50 аўтараў з 25 краін; таксама будзе шырока прэзентавана выданне «У рытме імклівых гадоў...», прысвечанае 100-годдзю маладзёжнага руху ў Беларусі. Сярод знакавых падзей трэцяга дня выстаўкі — цырымонія ўзнагароджання пераможцаў 58-га нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі» і падвядзенне вынікаў конкурсу «Мы робім па-людску?!», у якім беларусы праз СМС-галасаванне выбіраюць найлепшую айчынную кнігарню. Чацвёрты дзень арганізатары плануюць прысвяціць дзіцячай літаратуры — і не толькі адкрыць вялізную інтэрактыўную зону для маленькіх гасцей форуму, але і правесці мноства захапляльных літаратурных квэстаў, майстар-класаў, тэатралізаваных пастановак, а таксама падвесці вынікі акцыі «Пішам кнігу разам. Якой мы хочам бачыць Беларусь праз 10 гадоў», зладжанай сумесна Міністэрствам інфармацыі і Міністэрствам адукацыі Беларусі. Нарэшце, у заключны дзень выстаўкі будуць адзначаныя дыпломамі найлепшыя экспазіцыі.

Зрэшты, адметнасць сёлетняй выстаўкі не толькі ў кніжных мерапрыемствах, але і ў цэлым шэрагу падзей вакол кніг, якія ахопліваюць значна большую колькасць удзельнікаў. Пра што гаворка? Напрыклад, пра тое, што ў дні правядзення форуму ў беларускіх кінатэатрах, на тэлеканалах, у тэатрах будуць дэманстравацца фільмы і спектаклі, пастаўленыя паводле вядомых кніг. Ва Усіхсвяцкім храме-помніку пройдзе тэматычная выстаўка і будзе зладжана дыскусійная пляцоўка аб ролі кнігі ў фарміраванні культуралагічнай, духоўнай і маральнай складовай развіцця грамадства. Пры падтрымцы Мінгарвыканкама ўпершыню па маршруце ад станцыі метро «Няміга» да выставачнага комплексу плануецца запусціць адмысловы «паэтычны аўтобус», у якім будуць дэкламавацца вершы — магчыма, у выкананні лаўрэатаў конкурсу чытальнікаў «Жывая класіка». Яшчэ адна навінка выстаўкі — тэматычны гастратыдзень, на якім наведвальнікі змогуць ацаніць не толькі літаратурныя творы, але і стравы, прыгатаваныя паводле кніжных апісанняў (крыніцай натхнення для арганізатараў стала, у прыватнасці, «Новая зямля» Якуба Коласа, багатая на «смачныя» апісанні).

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# Ратавальнік у кішэні

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Гэты раздзел быў крыху дапрацаваны. Спачатку апавяшчэнні прыходзілі незалежна ад таго, у якім пункце знаходзіўся ўладальнік смартфона. Скажам, калі моцны дождж насоўваўся на Брэсцкую вобласць, а ў Віцебскай нія-кіх ападкаў і блізка не чакалася, то папярэджанне пра залеву атрымлівалі па ўсёй краіне. Акрамя таго, апавяшчэнні прыходзілі ў любы час сутак. Цяпер жа функцыянал зменены ў залежнасці ад катэгорыі з'явы надвор'я. Ранейшая мадэль работы пакінута толькі ў выпадках рэальнай небяспекі. Але варта зазначыць, што за 2018 год такія з'явы надвор'я не рэгістраваліся.

Другі раздзел па запатрабаванасці — «Што рабіць?», там размешчаны рэкамендацыі па тым, як самастойна дзейнічаць, калі вы сутыкнуліся з якой-небудзь надзвычайнай сітуацыяй. І вось тут статыстыка нас здзіўляе. Цікава, што самы праглядаемы матэрыял датычыцца алгарытму дзеянняў у выпадку, калі ў дом запаўзла змяя. На другім месцы — рэкамендацыі, што рабіць, калі разліўся хімічнае рэчыва. На трэцім месцы асталяваліся парады, якія датычацца ліквідацыі гнёздаў джаланосных насякомых — пэўна, гэтаму паспрыяла мінулае спякотнае лета.

Вялікай папулярнасцю карыстаюцца і тэсты, дзе можна праверыць, наколькі трывала замацаваліся веды па дзеяннях у надзвычайнай сітуацыі. А вось раздзел "Першая дапамога" мы стварылі ў кааперацыі з Беларускім таварыствам Чырвонага Крыжа. Там пералічаны сітуацыі, пры якіх магчыма аказаць першую дапамогу да прыбыцця брыгады хуткай дапамогі. Пры дапамозе адказаў на ўдакладняючыя пытанні чалавек атрымлівае інструкцыю да дзеянняў. Якая да таго ж агучваецца голасам. Такім чынам, абедзве рукі ў таго, хто аказвае першую дапамогу, аказваюцца вольныя. У свецелічыцца, што эфектыўнасць дзеянняў павялічваецца ў гэтым выпадку прыкладна на 40 працэнтаў. Агучка запрацуе і тады, калі тэлефон пераведзены ў бязгучны рэжым работы.

Агулам жа за мінулы год карыстальнікі прагледзелі больш за тры мільёны старонак у праграме. Больш за тое, ратавальнікі адкрыты да пажаданняў карыстальнікаў. Напрыклад, у каментарыях на старонцы праграмы ў Play Market прагучала пажаданне, каб у ім з'явіўся парадак дзеянняў пры зняцці ката з дрэва.

Мы вельмі рэкамендуем усталяваць нашу праграму на смартфон дзецям. Не выключана, што яна можа спатрэбіцца ў крытычны момант. Гэта ні ў якім разе не рэклама — наш аплет абсалютна бясплатны, ніякай рэкламы не ўтрымлівае, і мы ніколі не будзем імкнуцца зарабіць на ім якія-небудзь грошы. Тым больш што мабільны інтэрнэт патрэбны толькі для адной функцыі — апавяшчэння аб неспрыяльных справах надвор'я.

У мабільнай праграме «Дапамога побач» ёсць і схаваны раздзел. Неабходнасці ў яго актывацыі пакуль не было. Ён падрыхтаваны на выпадак прыродных катаклізмаў. Прыгадайце, што было падчас «Хаўера». Тады на аўтатрасах у снежным палоне захраслі тысячы людзей. Нехта дапамагаў гарачай гарбатай. Нехта дзяліўся палівам. Некалькі сайтаў і радыёстанцый добраахвотна ўзялі на сябе функцыю каардынатараў, але ўсё-такі гэта сталася спантанна. Дык вось, калі прырода нам падкіне што-небудзь накшталт «Хаўера», то будзе выведзена спецыяльная карта, дзе адлюструюцца кропкі трох колераў. Яны будуць абазначаць месцы, дзе знаходзяцца валанцёры, супрацоўнікі Чырвонага Крыжа і нашы ратавальнікі. Мы пакуль гэтую магчымасць тэставалі падчас буйнамаштабных вучэнняў.




Падчас работы мабільнай праграмы ў ніжняй частцы экрана пастаянна прысутнічае кнопка «112». З яе дапамогай можна выклікаць ратавальнікаў проста з аплета. Але наколькі папулярная гэта магчымасць? Націскаў на яе не так і шмат — прыкладна каля дзвюх тысяч. Мы ведаем, што гэтым функцыяналам карыстаюцца людзі з абмежаванымі магчымасцямі. У краінах Захаду можна «зашыць» у гэтую кнопку магчымасць выкліку хуткай дапамогі або блізкага сваяка з паралельнай адпраўкай СМС-паведамлення, у якім будзе інфармацыя аб узросце абанента, яго групе крыві і магчымай алергіі на лекавыя сродкі. Гэтыя напрацоўкі перанялі і мы.

Цікава, што нашай праграмай цікавяцца не толькі жыхары Беларусі. 8 % установак мае індыйскае паходжанне. Хто ведае, можа, тамтэйшыя службы вывучаюць наш досвед?

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Надвор'е



# У СТУДЗЕНІ ПАКУЛЬ НЕ ТАК І МАРОЗНА

**На працягу тыдня пераважны ўплыў на надвор'е ў краіне будуць аказваць атмасферныя франты. Чакаюцца няўстойлівыя ападкі і тэмпературны фон на 2—4 градусы вышэй за кліматычную норму, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўдзень снег будзе суправаджацца парывістым ветрам і завеяй. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра — ад 1 да 7 градусаў ніжэй за нуль. У сераду на большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе кароткачасовы снег і мокры снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Уначы будзе ад мінус 4 да мінус 10 градусаў, па паўночным усходзе пры праясненнях тэмпература панізіцца да 13 марозу. Днём чакаецца 1—7 марозу, у паўднёва-заходніх раёнах — ад нуля да плюс 2 градусаў.

З чацвярга нас чакае чарговая порцыя зімовага цяпла. У гэты дзень умовы надвор'я на тэрыторыі краіны будуць вызначаць атмасферныя франты, за якімі пачне паступаць больш цёплая паветраная маса з Заходняй Еўропы. Чакаецца пераважна воблачнае надвор'е, часам ападкі ў выглядзе снегу і мокрага снегу, які пераходзіць у дождж. Ападкі месцамі будуць суправаджацца моцным парывістым ветрам. Тэмпература паветра ўначы будзе знаходзіцца ў межах ад нуля — мінус 2 градусаў па паўднёвым захадзе, да 10—12 марозу па паўночным усходзе. Днём будзе ад мінус 2 да 4 градусаў цяпла. У пятніцу чакаецца адлiжнае надвор'е, аднак у выхадныя дні ападкаў стане менш і падмарозіць больш істотна.

**Сяргей КУРКАЧ.**


**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

| ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА |
|---|
| ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 422/С-974 (назначение – здание нежилое, наименование – кухня-столовая), площадью 1223,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Щучин, ул. Авиаторов, 3 |
| Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 425850100004000066, площадью 0,2172 га (назначение – содержание и обслуживание здания кухни-столовой) по адресу: г. Щучин, ул. Авиаторов, 3 |
| Начальная цена продажи – 80 000 руб. (восемьдесят тысяч рублей) с учетом НДС |
| Сумма задатка – 4 000 руб. (четыре тысячи рублей) |
| ЛОТ 2: капитальное строение, инв. № 422/С-739 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина «Авиатор»), площадью 78,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Щучин, ул. Авиаторов, 4А |
| Лот № 2 расположен на земельном участке, кадастровый номер 425850100004000033, площадью 0,0138 га (назначение – для обслуживания здания магазина) по адресу: г. Щучин, ул. Авиаторов, 4А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в зонах санитарной охраны водных объектов, используемых для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зонах санитарной охраны в местах водозабора, код – 2,7, площадью 0,0138 га; земельные участки, расположенные в зонах охраны недвижимых материальных историко-культурных ценностей, код – 6, площадью 0,0138 га |
| Начальная цена продажи лота – 36 000 руб. (тридцать шесть тысяч рублей) с учетом НДС |
| Сумма задатка – 1 800 руб. (одна тысяча восемьсот рублей) |
| Продавец – Щучинский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231513, г. Щучин, ул. Пушкина, 26, тел. (801514) 28-1-50 |
| Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38 |
| Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 5 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона |
| Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Аукцион состоится 29 января 2019 г. в 10.00 по адресу: Гродненская область, г. Щучин, ул. Пушкина, 26** |

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя, и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 30.08.2018 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).**

**Последний день приема заявлений – 24 января 2019 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*